Download



"Вясна" назірае

⚡Ціск на жыхароў Новай Баравой працягваецца. Чарговымі "суткамі" за сардэчкі на вокнах пакаралі мінчука

Суддзя Мінскага раёна Вадзім Казей 3 траўня разглядзеў справу **48-гадовага Дзмітрыя Перадня**, якога затрымалі 1 траўня ў сваёй кватэры.

Затрыманне адбылося каля 21:30 на вачах 7-гадовага дзіцяці пасля агляду кватэры. Супраць Дзмітрыя быў складзены пратакол па арт. 24.23 КаАП за пікетаванне **шасцю сардэчкамі**, вывешанымі на вокнах у двух пакоях.

Па словах мужчыны, сардэчкі вывесілі да Дня ўсіх закаханых. Пасля агляду супрацоўнікі міліцыі самастойна знялі сардэчкі з вокнаў, а самому Дзмітрыю прапанавалі праехаць з імі ў РАУС.

⚖На судзе Дзмітрый дадаў, што цяпер праходзіць курс лячэння, з-за чаго вымушаны пастаянна прымаць лекі. У выніку, **суддзя Вадзім Казей** асудзіў **Перадня** на **10 сутак.**

⚖Таксама **суддзя Казей** правёў мінімум два судовых працэса **падчас абеду**, таму нашы валанцёры не змаглі трапіць на працэс да **Наталлі Сляпцовай, Зотава Н. У. і Хамені І. А.**, якіх арыштавалі па арт. 24.23 КаАП на 12 сутак. Калі Вам вядомыя абставіны іх затрымання і суда, просім напісаць у бот: @viasna_bot
t.me/viasnanazirae/285
5.0K viewsMay 3, 2021 at 17:26